# «НЕ ПАКІДАЦЬ СВАЕ ТРЫБУНЫ…»



**21 сакавіка 2024 года ў Гродне адзначылі Сусветны дзень паэзіі. Галоўнай у выступленнях творцаў была тэма мірнага неба над нашай Радзімай.**

Дзень сённяшні нясе для літаратуры і ў прыватнасці для паэзіі мноства сур'ёзных выпрабаванняў. «Хто цяпер чытае гэтыя кнігі?! – разважае ўдзельніца ток-шоу на адным з айчынных тэлеканалаў, – Вось блогеры – сапраўды, тое, што трэба!» ...У сваёй працы мы выразна адчуваем, наколькі змяняецца стаўленне да традыцый. У горшы бок. Літаратары Гродзеншчыны ніколі не цураліся прагрэсу, не з'яўляліся супернікамі наватарства, стараючца крочыць па жыцці ў нагу з часам. І багатай культурнай спадчыны, якую пакінулі нам класікі, мы ніколі не дамо ў крыўду. Абавязак кожнага грамадзяніна Беларусі – беражлівыя адносіны да нашага мінулага, да нашых гісторыі і культуры. Абавязак кожнага культурнага чалавека – увага да сучаснай літаратуры, яе падтрымка, здольнасць аналізу актуальных тэндэнцый, імкненне працягваць традыцыі чытання. І ўсё гэта – у дыялогу з часам, з апорай на класіку, з павагай да сучаснасці. Менавіта так, як прынята паважаць старэйшых, трапятліва клапаціцца аб жанчыне і дзіцяці, як трэба любіць сваю Радзіму, берагчы прыроду, – абавязак кожнага свядомага грамадзяніна ведаць і любіць сваю літаратуру. Паўтараем: ведаць сваё, чытаць сваё, падтрымліваць сваё – гэта грамадзянскі абавязак кожнага! Калі хтосьці лічыць айчынную кнігу нецікавай, непрывабнай, не вартай увагі і павагі, раім больш уважліва прыгледзецца да сябе, да свайго ладу жыцця. Таму што літаратура – гэта адлюстраванне рэчаіснасці. Сапраўдная літаратура – люстэрка для сапраўднага жыцця. А не для яго віртуальнай імітацыі. Сапраўдны творца ніколі не стане бязвольным закладнікам тэхналогій, жывым дадаткам да гаджэта. Паэзія заўсёды, ва ўсе часы вяла за сабой, ніколі не апускалася да нізінных патрэбаў. Паэтычнае слова было і будзе зброяй праўды. І паэзія Беларусі – не выключэнне.

Шмат важнага пра значэнне паэзіі ў жыцці чалавека прамовіла старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч у сваім уступным слове да прысвечанай Сусветнаму дню паэзіі святочнай праграмы «Паэзія на ўсе часы», якая 21 сакавіка сабрала ў аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной бібліятэкі аматараў паэзіі рознага ўзросту. У прамове аб сацыяльнай значнасці паэтычнага мастацтва Людміла Антонаўна згадала трапныя радкі рэпрэсаванага беларускага паэта Тодара Кляшторнага – пра




абавязак сапраўднага паэта, як бы цяжка не было, «Не пакідаць грамадскай варты, // Не пакідаць свае трыбуны…». Было прамоўлена шмат важкіх слоў, выказана мноства шчырых пажаданняў. Пачалося свята з хвіліны мўчання ў памяць аб тых паэтах Прынёмання, якія за час існавання абласнога аддзялення СПБ пайшлі з жыцця. Па традыцыі найбольш актыўныя і паспяховыя калегі з рук кіраўніка абласной пісьменніцкай арганізацыі атрымалі падзячныя лісты і граматы Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Слоў падзякі заслужылі калектыў і адміністрацыя Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага за дапамогу ў арганізацыі і правядзенні святочнага мерапрыемства «Паэзія на ўсе часы». Спецыяльна да Сусветнага дня паэзіі тут падрыхтавалі прыгожую кніжную выставу з выданнямі сучасных паэтаў з Гродна і Гродзенскай вобласці, калектыўнымі і індывідуальнымі (*на фота*). З грамадскай трыбуны да сучаснікаў звярнуліся члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэты: Браніслаў Ермашкевіч, Тамара Мазур (Гродзенскі раён), Віктар Кудлачоў, Ірына Фамянкова, Рыгор Гармаш, Анатоль Апанасевіч, Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён), Кацярына Каламійцава, Дзмітрый Радзівончык. Не абышлося без цікавых сюрпрызаў. Песню Ірыны Фамянковай, тэкст якой створаны на аснове песні Алега Міцяева «Как здорово, что все мы здесь сегодня собрались», хорам выконвала ўся зала. Анатоль Апанасевіч, акрамя чытання аўтарскага верша, выканаў песню ўласнага сачынення «Гарадзенскі вальс». Сапраўдным упрыгожваннем святочнай праграмы стала выступленне вакальнага ансамбля «Раскоша» Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў (мастацкі кіраўнік Таццяна Віктараўна Сцецкая). У творчай праграме ансамбля прагучала песня на словы члена СПБ, гродзенскай паэтэсы Марыі Цітарчук (1985-2021) «О, Бацька Нёман, дай мне сіл».




**Старшыня ГрАА СПБ**
**Л. А. Кебіч**








**Па традыцыі найбольш актыўныя і паспяховыя калегі з рук кіраўніка абласной пісьменніцкай арганізацыі атрымалі падзячныя лісты і граматы Саюза пісьменнікаў Беларусі**




**Выступае вакальны ансамбль «Раскоша» Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў (мастацкі кіраўнік Таццяна Віктараўна Сцецкая)**

У пацверджанне тэзіса аб актыўным рэагаванні сапраўднай паэзіі на тое, што адбываецца ў навакольным свеце, удзельнікі літаратурнага вечара «Паэзія на ўсе часы» выступілі з творамі грамадзянскай, грамадзянска-патрыятычнай, ваенна-патрыятычнай, філасофскай лірыкі. Ідэйнай асновай усёй праграмы стала тэма мірнага неба над нашай Радзімай. Напрыклад, Браніслаў Ермашкевіч прадставіў вершы, прысвечаныя Вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, свайму дзяцінству, абпаленаму вайной. Таксама Браніслаў Іосіфавіч прачытаў прысвячэнне вобразу класіка беларускай паэзіі Францішка Багушэвіча, які нарадзіўся ў 1840 годзе менавіта 21 сакавіка. …Украінскі паэт з Гродна Рыгор Гармаш прысвячае большасць з уласных вершаў трагічнаму лёсу сваёй роднай Украіны. Сёлета паэт стаў лаўрэатам Украінскай нацыянальнай літаратурнай прэміі імя Тараса Шаўчэнкі. Гэта азначае, што ўвасобленыя аўтарам ідэі адзінства славянскіх народаў знаходзяць водгук у сэрцах суайчыннікаў. Шчырыя радкі Рыгора Сцяпанавіча вельмі расчулілі прысутных. …Тэму славянскага адзінства працягнула сёлетні навабранец СПБ, паэтэса Кацярына Каламійцава і агучыла верш «Сила колыбельной», напісаны адразу на трох мовах – беларускай, рускай і ўкраінскай. …Мікалай Іваноўскі прысвяціў сваё выступленне тэме Перамогі над фашызмам і прачытаў да болю кранальны верш пра спаленую фашыстамі вёску Шавулічы, што на яго роднай Ваўкавышчыне. …Людміла Антонаўна Кебіч прачытала нізку лірычных прысвячэнняў вобразу горада Гродна і зрабіла прэзентацыю зборніка літаратурна-мастацкіх твораў «Лепшы горад Зямлі», выдадзенага да 895-годдзя горада над Нёманам. Аўдыторыя сустракала выступленні ўдзельнікаў святочнага літаратурна-музычнага мерапрыемства гучнымі апладысментамі. Удзел у святе паэтаў «дзяцей вайны» Віктара Сямёнавіча Кудлачова і Браніслава Іосіфавіча Ермашкевіча стаў красамоўным прыкладам абароны гістарычнай праўды і пераемнасці пакаленняў. Атмасфера ў зале панавала ўрачыстая і па-сяброўску цёплая. У фінале імпрэзы ў традыцыйнай рубрыцы «Вольны мікрафон» паэты пачулі сардэчныя віншаванні з Сусветным днём паэзіі ад сваіх сяброў і чытачоў.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** удзельнікі літаратурнага вечара «Паэзія на ўсе часы», прысвечанага Сусветнаму дню паэзіі. Аддзел мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага. 21 сакавіка 2024 года.



**Браніслаў Ермашкевіч**



**Тамара Мазур**



**Віктар Кудлачоў**



**Ірына Фамянкова**







**Рыгор Гармаш** **Анатоль Апанасевіч**







**Мікалай Іваноўскі** **Кацярына Каламійцава**




**Дзмітрый Радзівончык**




**Людміла Кебіч**



**Л. А. Кебіч і Т. В. Сцецкая**




**У фінале імпрэзы**
**паэты пачулі сардэчныя віншаванні**
**з Сусветным днём паэзіі ад сваіх сяброў і чытачоў**







**Віншаванні з Сусветным днём паэзіі ад чытачоў і сяброў**




**Усе разам**

[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)